PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
# ВОПЫТ, МЕТОДЫКА І ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
# І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Электронны зборнік навуковых артыкулаў
IV міжнароднай навуковай канферэнцыі
да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта

(Полацк, 19–20 красавіка 2018 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А. І. Корсак

Наваполацк
ПДУ
2018

PolotskSU

УДК 94(476)(082)
ББК 63.3(4Беи)я43

Рэдакцыйная калегія: д-р гіст. навук, праф. Д. У. ДУК;
канд. гіст. навук, дац. В. В. ДАНІЛОВІЧ;
чл.-кар. НАН Беларусі, д-р гіст. навук, праф. М. Ф. ПІЛІПЕНКА;
канд. гіст. навук, дац. А. І. КОРСАК (адк. за вып.);
канд. гіст. навук, дац. В. А. ЕМЯЛЬЯНЧЫК;
канд. гіст. навук, дац. У. А. ЛОБАЧ

Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў [Электронны рэсурс] : электрон. зб. навук. арт. IV міжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацк, 19–20 крас. 2018 г. / Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт ; пад агул. рэд.: А. І. Корсак. – Наваполацк, 2018. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).
ISBN 978-985-531-617-7.

*Выдаецца з 2018 года (у друкаваным выглядзе – з 2004 г.)*

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы IV міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў». Прадстаўлены вынікі археалагічных, антрапалагічных і этнаграфічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, мовазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, мастацтвазнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

Зборнік уключаны ў Дзяржаўны рэгістр інфармацыйных рэсурсаў. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 3031816593 ад 08.10.2018.

Дызайн вокладкі *У. А. Крупеніна*
Тэхнічнае рэдагаванне *Т. А. Дар'янавай, В. П. Міхайлавай*
Камп'ютарная вёрстка *Д. М. Севасцьянавай*

211440, вул. Блахіна, 29, г. Наваполацк, Беларусь
тэл. 8 (0214) 39 40 46, e-mail: a.korsak@psu.by

ISBN 978-985-531-617-7 © Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2018

PolotskSU



УДК 94(476):72(091)

# ГІСТОРЫЯ ХРАМАЎ УШАЧЧЫНЫ Ў САВЕЦКІЯ ЧАСЫ (1917 – 1991 гг.)

*Н.А. МІЗЯРСКА*
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт

*Артыкул прысвечаны гісторыі хрысціянскіх храмаў на тэрыторыі Ушацкага раёна ў савецкі перыяд.*

***Ключавыя словы:*** *храм, Ушаччына, савецкая ўлада, перабудова, адраджэнне.*

З прыходам да ўлады ў кастрычніку 1917 г. бальшавікоў і ўстанаўленнем савецкай улады на Беларусі, становішча ўсіх канфесій змянілася: пачалася доўгая, палітая крывёю многіх пакаленняў канфрантацыя дзяржавы і царквы. Такая палітыка была выклікана тым, што марксізм-ленінізм разглядаў барацьбу з рэлігіяй як адзін з напрамкаў класавай барацьбы пралетарыята з капіталам. Распрацоўваючы пытанні адносін бальшавікоў да рэлігіі У. Ленін у рабоце “Сацыялізм і рэлігія” падкрэсліваў неабходнасць жорсткіх адносін да рэлігійных вераванняў [13, с. 155-156]. Па меркаванню М. І. Калініна рэлігію з яе сакрамэнтамі: хрышчэннем, вянчаннем, адпяваннем, павінны былі замяніць новыя абрады і традыцыі – савецкія святы, тэатры і тэатралізаваныя прадстаўленні [14, с. 6 ].

У сярэдзіне лістапада 1917 г. ва Ушачах Сход валрэўкома пастанавіў: безагаворачна прызнаць савецкую ўладу, актыўна падтрымаць усе мерапрыемствы ўрада. Было вырашана канфіскаваць маёмасць мясцовых памешчыкаў і царкоўныя землі на Ушаччыне. Адабранай зямлёй павінны былі надзяліць батракоў і малаземельных сялян Ушацкай воласці [15]. Супраць рэлігіі быў накіраваны дэкрэт Савета Народных Камісараў ад 20 студзеня 1918 г. “Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы”. Па меркаванню бальшавікоў царква часта навязвала непрыстойныя імёны, якія нібы зневажалі чалавека: Авель, Зілота, Глікія [14, с.31], таму ў студзені 1920 г. з’явілася адпаведнае распараджэнне, якое дазваляла для нованараджонага даваць любое імя, нават калі такога не было ў царкоўным календары. У антырылігіозным рэчышчы трансфармавалася адукацыйная праграма. Архіўныя даныя сведчаць, што на Ушаччыне ў школах праводзілася выхаваўчая праца з антырэлігійнай накіраванасцю: “Антырэлігійныя вераванні праводзіліся з праграмным матэрыялам. Вучні ўдзельнічалі ў правадзімых мерапраемствах аб шкоднасці каляд і вялікадня. Заняткі ў школе праводзіліся ў царкоўныя дні” [ 2, ф.150, оп.1, д.25].

Першы ўдар прынялі на сябе святары Ушаччыны. Напрыклад, у 1919 – 1922 гг. у каталіцкай парафіі на Ушаччыне працаваў ксёндз Язэп Барадзюля, які быў абвінавачаны савецкімі ўладамі ў шпіянажы і высланы ў Сібір на 25 год (у 1954 г. ксёндз Я. Барадзюля быў вызвалены і атрымаў парафію ў Літве).

Пік антырэлігійнасці на Ушаччыне прыпаў на 1929 – 1939 гг. Савецкая ўлада не толькі садзейнічыла распаўсюджванню атэізму сярод дарослых і моладзі, але і вынішчэнню сакральных аб’ектаў. Пасля 1930 г. была часткова разабрана праваслаўная царква (былы дамініканскі касцёл) ва Ушачах, які знаходзіўся на вуліцы Кастрычніцкай.

PolotskSU



Першы паверх царквы, аднак, ацалеў. Пазней яго перабудавалі ў Дом культуры, дзе збіраліся партыйныя актывісты [16, с. 470-471].

Пра лёс Кубліцкай царквы, якая некалі была ўніяцкай, успамінаў Васіль Быкаў: "У 30-я гады з царквы садралі крыжы з царкоўных купалоў, але бурыць царкву пачалі самі. Усё царкоўнае майно сканфіскавалі або проста расьцягалі ваяўнічыя атэісты, якімі абавязаны былі быць усе піянеры, камсамольцы, бальшавікі, настаўнікі і актывісты. І мы піянеры-актывісты, цягалі з царквы і дралі старажытныя фаліянты, клеілі з царкоўных рукапісных пергамэнтаў папяровых зьмеяў, якія запускалі ў ветраныя дні. З царкоўных жа рызаў раённы быткамбінат пашыў цюбіцейкі, у якіх шмат год хадзілі нашы хлопцы" [1, с.19-20]. У 1942-1948 гг. падчас бамбардзіроўкі немцамі Кубліч храм быў разбураны і ў такім стане заставаўся да канца вайны. У 1948 г. жыхары вёскі разабралі рэшткі касцёла на цэглу [16, с. 490]. Сёння можна ўбачыць толькі фрагменты фундамента.

У гады Вялікай Айчыннай вайны на беларускіх землях нацысты распрацавалі сваю палітыку ў адносінах да канфесій, якая прадугледжвала адраджэнне царквы ў жыцці насельніцтва. З гэтай мэтай забаранялася працаваць у нядзелю. Парушальнікі дадзенага загаду падвяргаліся штрафам і нават расстрэльваліся. Насельніцтва акупіраваных тэрыторый павінна было адзначаць рэлігійныя святы па старым стылі, у кожным доме мецць іконы, насіць крыжы на шыі, хрысціцца перад і пасля ежы. Усе ранейшыя грамадзянскія акты (рэгістрацыя дзяцей, вянчанні, пахаванні) лічыліся несапраўднымі. З архіву Вермахта, вядома што ва Ушачах у гады Вялікай Айчыннай вайны немецкія захопнікі хавалі сваіх салдат ля сцен касцёла, які працаваў у той час [11].

Нацысты не перашкаджалі адкрыццю храмаў, асабліва праваслаўных, якія былі зачынены ў перадваенныя гады. Абавязковай умовай рэлігійнага жыцця з'яўлялася беларуская мова. Разам з тым нямецкая адміністрацыя не толькі дазвалялі адкрываць храмы, але і аддавала загад спальваць іх, як толькі даведвалася аб сувязях вернікаў прыхода з партызанамі [13, с. 216-219].

Пасляваенныыя гады заставаліся складанымі ў жыцці канфесій. Вайна нанесла храмам вялікія матэрыяльныя страты: некаторыя храмы былі цалкам разбураны, многія моцна пашкоджаны. Зноў пачалося згортванне рэлігійнага жыцця, якое адрадзілася ва ўсіх рэгіёнах у ваенны час. Большай лаяльнасцю вызначаліся адносіны партыйна - дзяржаўных структур да праваслаўнай царквы, чаму садзейнічыла пашырэнне кантактаў І. Сталіна і яго акружэння с Патрыярхам Маскоўскім і ўсея Русі Алексіем І [13, с. 234-235].

На Ушаччыне ў паслеваенныя гады атэізм адраджаўся хуткімі тэмпамі. Асабліва вострай была барацьба супраць каталіцкага касцёла і яго ўплыву на насельніцтва. Праваслаўная царква некаторы час працавала, але таксама была знішчана: ушачане разабралі яе для сваіх патрэб у гаспадарцы [16, с. 495].

Касцёл Найсвяцейшай Марыі ў Селішчах вядомы з апісанняў Я. Фібека з 1913г.: "Касцёл узносіўся над возерам, пры ім быў збудаваны двухпавярховы кляштар. Касцёл меў 5 метраў у вышыню. Над галоўным алтаром вісеў абраз Божай Маці, які быў перавезены з Кубліч. Ён быў пакрыты срэбрам. Захрыстыя ў касцёле была вельмі багатай, бо тут было сабрана шмат рэчаў з суседніх храмаў: арнаты, упрыгожаныя срэбрам і золатам, пашытыя са слуцкіх паясоў" [17, с. 411-412]. Касцёл у Селішчах быў зруйнаваны ў перыяд з 1944 па 1989 год [16, с. 494].

PolotskSU



Сярэдзіна 1950-х і пачатак 1960-х гг. азнаменаваліся паступовым разгортваннем чарговага рэлігійнага ўціску. Калі раней, у 1920-30-я гг. царква разглядалася як "Класавы вораг" і барацьба з ёй з'яўлялася часткай барацьбы за сацыялізм, то ў 1950-я гг. на змену прыйшло бачанне рэлігіі як рэакцыйнай, "ідэалагічна чужой" сацыялізму з'яве. Рэлігія разглядалася ў якасці галоўнага ворага навуковага светапогляду, а вернікі залічваліся ў разрад свядомых ці несвядомых носьбітаў чужых поглядаў і нораваў. У дзяржаве была абвешчана ідэя камуністычнага будаўніцтва, дзе не было месца для рэлігіі [13, с. 264]. Успамінае інфармант з вёскі Мосар Ушацкага раёна: "Мой бацька летаў у адным самалёце з Берагавым, быў яго механікам, а як вернуўся с вайны, стаў прадседацелем калхоза. На то время я помню баба наша Аляксандрына перасялілась к нам з Чарсвяд, перевезла і старынныя іконы свае. Ну бацька мой как камуніст і значыт председацель, тапаром іх пабіў, пакрышыў. А что было делать, нада было прімер падаваць астальным гражданам" [8].

Тых людзей, якія ў савецкія часы руйнавалі храмы, напаткаў несшчаслівы лёс. Успамінае жыхарка з вёскі Пліна Ушацкага раёна Леановіч А.А.: "Гаварылі, з тых, хто разбураў святыні, вырывалі крыжы, палілі абразы, ніхто не памёр сваёй смерцю. Здараліся розныя страшныя выпадкі, напрыклад, старшыню калгаса, які прымаў удзел у ліквідацыі храмаў, задавіла машына. Стаяў у двары, а машына сама пакацілася, прыціснула яго да сцяны і ён памёр" [6]. Па словах інфарманткі, некаторых людзей, якія руйнавалі Ушацкі касцёл, таксама напаткала бяда: "С рассказаў старэйшых ізвестна, что адзін чалавек зрываў у нас бляшаную крышу з касцёла, бо яна была з жэсці і рабіў вёдры дома патом. З ім здарылася бяда, і ён памёр" [4].

У 1967 г. у дакладзе "50 гадоў вялікіх перамог сацыялізму" было заяўлена, што ў СССР пабудавана "развітое сацыялістычнае грамадства", якому ўласцівы непарушная ідэйна-палітычная згуртаванасць працоўных, іх самаахвярная адднасць ідэалам партыі, вернасць прынцыпам марксізма-ленінізма, высокая ступень сталасці ўсіх грамадскіх адносін. У такім грамадстве для рэлігіі не было месца. Існаваў неабгрунтаваны тэзіс "аб крызісе рэлігіі". Таму працягвалася палітыка закрыцця цэркваў, зняцця з рэгістрацыі праваслаўных абшчын. На ахове дзяржавы стаяла і заканадаўства, якое ўсё больш абмяжоўвала магчымасці вернікаў весці актыўнае рэлігійнае жыццё. Быў прыняты ўказ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР "Аб адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне заканадаўства аб рэлігійных культах", прыняты 1 красавіка 1966 г. Гэты ўказ прадугледжваў за правядзенне рлігійных сходаў і іншых цырымоній штраф у памеры 50 рублёў. Для ўтаймавання найбольш актыўных вернікаў штрафныя санкцыі лічыліся недастатковымі, таму адначасова быў прыняты ўказ Прэзідыўма Вярхоўнага Савета БССР "Аб унясенні дапаўненняў у артыкул № 139 Крымінальнага кодэкса", які прадугледжваў пакаранне пазбаўленнем волі тэрмінам да трох гадоў асоб, "якія раней судзіліся за парушэнне законаў аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы, а таксама арганізацыўную дзейнасць, накіраваную на ўчыненне гэтых дзеянняў" [13, с. 293-294].

Важным кірункам аховы насельніцтва, у першую чаргу моладзі, ад рэлігійных уплываў з'яўлялася ўкараненне новай сацыялістычнай абраднасці. Была прынята пастанова "Аб рабоце савецкіх органаў па ўкараненні грамадскіх абрадаў", згодна з якой пры гарадскіх, раённых, сельскіх і пасялковых Саветах пачалі дзейнічаць грамадскія камісіі па

PolotskSU



абрадах. Асноўную ўвагу яны ўдзялялі правядзенню ўрачыстай рэгістрацыі шлюбаў і нараджэнняў. З'явіліся камсамольскія вяселлі і хрышчэнні. У такіх мерапрыемствах прынімалі ўдзел мясцовыя савецкія органы, партыйныя, камсамольскія арганізацыі [ 13, с. 295]. Па словах інфарманткі Клімавай І. С. вядома, што: "Моя мама рассказывала, что был такой момент, что вывешивали списки в сельсоветах и потом начинали людей гнобить. И потом если у тебя у власти знакомых нету, то могли и уволить с работы. Мама наша боялась крестить, сами покрестились, когда уже можно было" [5]. Жыхарка Ушаччыны Каплеўская Марыя Сяргееўна ўзгадвала: " Я приехала работать сюда в 1958г., в Дольцах, Ушачах, Глыбочанах, где я работала церковь не работала. Работала в Лепеле і Полоцке церковь. Тогда за учителями назначались деревни, и они были ответственные, агитаторы. И если у тебя что случилось: перекрестил кто и ты не знаешь, могли тогда тебя с работы снять, так как ты за это всё отвечаешь. Некаторые верующие тайно крестили детей. Вот, родился у меня сын Серёжа, ну значит по традиции как тогда делали: собрали всех родственников, была крёстная мать, хотя никого не крестили. Надо было садить кого-нибудь за крёстную матку и батьку. Приходили представители партийные из сельсовета посвящали новорожденного красным галстуком пионерским. Дарили такой наборчик: портретик Ленина, галстук и звёздочка октябрятская" [12].

Некаторыя ушачане, па словах інфарматкі Каваленка А.Б., якія займалі пасады і працавалі настаўнікамі, аднак імкнуліся патаемна ахрысціць сваіх дзяцей: «Я крестила своих детей в начале 1980-х тайно. Поздней ночью я и ещё несколько моих коллег-учителей собрались и повезли в Прозороки в церковь детей крестить. Батюшку попросили в церковную книгу не записывать, а детям строго-настрого запретили рассказывать в школе о том, что с ними было. Очень рисковали и боялись, так как могли нас выгнать с работы» [9].

Непажадана было насельніцтву Ушаччыны таксама мець абразы ў сваёй хаце, што вядома са слоў інфарманткі Відзевіч В.П.: "Калі брат уступіў у партыю камуністычную, то ён загадаў маці зняць са сцяны лепшага пакою абраз старажытны. Мама вельмі растроілася, але ж прыхадзілі да нас братавыя калегі-настаўнікі, партыйцы. Святы царкоўныя мы святкавалі патаемна ў сваёй хаце без брата, але можа, першай прычынай аднак была не вера ў Бога, а таму што на стол ставіліся дэлекатэсы розныя. Бо кожны дзень есці дэлікатэсы ў 1970-я гады ніхто не мог сабе дазволіць з прычыны дэфіцыту" [3].

Камуністычная ідэалогія моцна адбілася на падрастаючым пакаленне савецкіх школьнікаў. Успамінае Каваленка Н.А. свае школьныя гады: "Когда я училась в шестом классе несколько отличников и хорошистов из нашего класса первыми посвятили в пионеры. После торжества, которое проходило в нашем музее, я пришла домой сняла пионерский галстук и значок и положила в секцию за стекло на самое почётное место. Когда бабушка это увидела, то гневу её не было предела, она Ленина идолом назвала и убийцей, рассадником зла. Я не понимала тогда её гнева, так как нам в школе по-другому говорили всё. А моя одноклассница даже повязывала галстук на ночную сорочку " [10].

У пасляваенны савецкі час насельніцтва хадзіла ў суседнія з Ушаччынай рэгіёны, дзе веруючыя людзі насуперак партыйным уладам наведвалі храмы, аб чым вядома з успамінаў жыхаркі з вёскі Опса Браслаўскага раёна: "Касцёлы грамілі яшчэ раней, чым

PolotskSU



я нарадзілася. Мая мама казала, што калі руйнавалі Браслаўскі касцёл, то камуністы спачатку маліліся: сталі на калені, перажагналіся, прачыталі літанне і ружанец, а ўжо потым руйнавалі. На мой час касцёлы пер态варылі ў склады, дзе сядзелі галубкі, паўсюдна загадзіўшыя храм. Уціск вернікаў прыйшоўся на 1980-е гады. Мае матка і бацька заўсёды выклікаліся ў школу на бацькоўскія сходы, бо я старалася наведваць касцёл. Наш класны кіраўнік пастаянна казала, што ў яе ёсць чорны сшытак, і папярэджавала нас, хто пойдзе да касцёла на Вельканац, будзе запісаны ў гэты сшытак. Але ўлічваючы, што такіх як я было з класа чалавек дванаццаць, а гэта была ўжо большасць, то напужаць нас было цяжка. Кожны раз, пасля наведвання касцёла, маіх бацькоў выклікалі у школу, ругалі і папярэджвалі. А потым у 1989 г., калі я заканчвала школу, ужо была трошкі такая адліга, але аднак усе мяне пужалі, што я не закончу школу. На сёняшні розум, я не магу зразумець, як гэта не закончыць школу? Напэўна былі іншыя ўстановы, якія патрабавалі каб вучань выпускаўся з адзнакай са школы, а рэлігійная самасвядомасць у дакуменце ж не была ўказана ў базавай, ці сярэдняй адукацыі? Мы баяліся, хваляваліся, што так будзе, але ж так былі выхаваны, што сядалі ў нядзелю ў аўтобус і ехалі ў Браслаў да касцёла” [7].

З прыходам да ўлады ў СССР М.С. Гарбачова ў 1985 г. паступова змяніліся адносіны дзяржавы да рэлігіі. Аб гэтым сведчыць вынікі работы Усесаюзнай партыйнай XIX канферэнцыі ў 1988 г. і святкаванне 1000-годдзя Хрышчэння Русі. У БССР юбілей прайшоў без ідэалагічнага ўціску. Актывізацыяй рэлігійнага жыцця спрыялі і абвяшчэнне палітычнай і эканамічнай незалежнасці новай дзяржавы – Рэспублікі Беларусь, дзе кожнаму грамадзяніну было прадстаўлена права спавядаць любую рэлігію і наведваць храм [13, с. 315-317]. Рэлігійнае жыццё ва Ушацкім раёне пачало адраджацца таксама ў гэты перыяд. На сёняшні момант, на Ушаччыне дзейнічаюць 2 праваслаўных царквы (Парасkевы Пятніцы ў Арэхаўне і Мінадоры, Мітрадоры і Німфадоры ва Ушачах), і 1 каталіцкі касцёл Святога Лаўрэна ва Ушачах

ЛІТАРАТУРА

1. Быкаў, В. Доўгая дарога дадому. Кніга ўспамінаў / В. Быкаў ; прадмова аўтара ; мастак А. Бохан. – Мінск : Кніга, 2004. – 544 с.
2. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Ф. 150. «Матэрыялы аб рабоце Мосарскай школы». Воп. 1. Спр. 25.
3. Запісана Мізярска Н.А. (ЗА) у 2017 г. ад Відзевіч Валянціны Пятроўны, 1952 г.н., у г.п. Ушачы
4. ЗА у 2017 г. ад Ісаковіч Валянціны Эдуардаўны, 1947 г.н., у в. Усвея Ушацкага р-на.
5. ЗА у 2018 г. ад Клімавай Інэсы Сяргееўны, 1969 г.н., у в. Шніткі Сарочанскі с/с.
6. ЗА у 2017 г. ад Леановіч Алены Антонаўны, 1953 г.н., у в. Пліна Ушацкага р-на.
7. ЗА у 2017 г. ад Любачка Марыі Казіміраўны, 1972 г.н., у г.п. Бешанковічы.
8. ЗА у 2017 г. ад Каваленка Аляксандра Фѐдаравіча, 1949 г.н., у г.п. Белае Ушацкага р-на.
9. ЗА у 2018 г. ад Каваленка Алены Баляславаўны, 1950 г.н., у г.п. Ушачы
10. ЗА у 2018 г. ад Каваленка Наталлі Аляксандраўны, 1976 г.н., у г.п. Ушачы

PolotskSU



11. Кавалеўская, К. Рэха вайны пад сценамі касцёла / К. Кавалеўская // Патрыёт. – 2018. – № 9 (9726) – С. 3.
12. ЗА у 2018 г. ад Каплеўскай Марыі Сяргеяўны, 1934 г.н., у г.п. Ушачы.
13. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII – XX ст.) / В.В. Грыгор'ева [і інш.] ; навук. рэд. У.І. Навіцкі. – Мінск : Экаперспектыва, 1998. – 340 с.
14. Мелешко, А.А. Современные гражданские обряды и традиции / А.А. Мелешко. – Минск : Полымя, 1985. – 143 с.
15. Міхайлаў, А. Наш родны кут. Да 50-годдзя савецкай улады / М. Міхайлаў // Патрыёт. – 1967. – № 16.
16. Fibek, J. Dzieje parafii i klasztorów katolickich na Białorusi. T. 1. Wschodnia część Diecezji Witebskiej. Łomża : Zakon Braci Mniejszych Kapucynów, Prowincja Warszawska, 2016. – 692 s.
17. Zyskar, J. Nasze koscoly. T. 1. Archidjecezja Mohylowska – Warszawa. Petersburg, 1913. – 443 s.

*THE HISTORY OF USHACHI TEMPLES IN THE SOVIET PERIOD (1917 - 1991)*

*N. MIZIARSKA*

*The article concerns the history of Christian temples at the Uschachi Territory in the Soviet Union's period.*

*Keywords: temple, Usachchyna, soviet authority, restructuring.*